най дзейнасцю, могуць шырока і эфектыўна выкарыстоўвацца ў ВНУ і сярэднеспецыяльных навучальных установах мастацтваў.

## ДА ПЫТАННЯ АБ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЕ РУСІСТЫКІ

Н.А.Булацкая

Адказ на пытанне: што такое беларуская школа русістыкі, ці з'явіцца, ці ёсць яна – адкажа час. Многае не разгадана.

Сення, асабліва сярод інтэлігенцыі Беларусі, часта паўтараецца прыметнік "Нацыянальнае": нацыянальныя праблемы, нацыянальныя адносіны, нацыянальная культура і г.д. З аднаго боку, гэта даніна модзе ў сувязі з нацыянальным самавызначэннем былых 15 з СССР. Але з другога боку, нацыянальныя праблемы былі і ў час палеаліту. І калі згадзіцца з тэорыяй, прапанаванай Л.М.Гумілевым, развіцце нацыянальных адносін галоўным чынам залежыць ад ўзроўню пасіянарнасці і стану этнасаў. Што датычыць этнаса, то ў беларусаў ёсць станоўчая рыса (у адрозненні ад іншых этнасаў): менавіта прыналежнасць да беларусаў адзначаецца не толькі па дакументу. Больш складана з пасіянарнасцю. Калі пад ёй разумець "эффект энергии живого ветества, биосферы, которая существует по всей земле", не духоўную, а біяхімічную энергію, дык тое, што назіраем сення на Беларусі – не духоўны працэс. На Беларусі даўно паспяваў этнічны надлом, і пасіянарнасць ў гэтай сітуацыі можа надаць гэтаму працэсу рух. Пытанне ў тым, па якому шляху: агрэсіўнасці да ўсяго іншага, не "свайго", альбо міралюбівага супрацоўніцтва. Беларускім русістам нельга не улічваць гэты фактар.

Вызначылася, на маю думку, тэндэнцыя звязваць нацыянальную беларускую культуру перш за ўсе з мовай. У такім выпадку на першае месца ў барацьбе за нацыянальную культуру выходзіць клопат аб мове. Мова становіцца прадметам палітыкі, ідэалогіі. Аб мове як навуцы забываюць. Але ж вядома, што многія (калі не большасць) з сучасных нацый карыстаюцца мовамі іншых народаў, чаючы пры гэтым своеасаблівую нацыянальную культуру. Ды і носьбіты розных моў могуць быць прадстаўнікамі адной культуры. Урэ-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шце, справядліва і адваротнае. Нагадаем хаця б імены У.Набокава, Ч.Айтматава, Свіфта, Шоў. Пагэтаму для беларускіх русістаў падставай у рабоце павінны быць не эмоцыі і палітыка, а навука.

Праблема нацыянальнага хвалявала і хвалюе пісьменнікаў. Цікавіўся ею, напрыклад, П.Чаадаеў. Свае меркаванні выказаў у "Философических письмах". А ў лісце да графа С.Строганава ад 8 лістапада 1836 г. напісаў: "Народы Запада, отыскивая истину, нашли благополучие и свободу". Значыцца, вызначылі галоўнымі ў жыцці матэрыяльныя каштоўнасці і індывідуальную свабоду. Але ж у Расіі (упэўнена, і на Беларусі) іншая мэта, іншая роля - выратаванне і захаванне духоўнасці. Чаму ж не звярнуцца за дапамогай да Пушкіна, Гогаля, Дастаеўскага... А то любоў да Бацькаўшчыны выглядае часам як ненатуральная пахвальба "сваім".

Ідэя нацыянальна-беларускага ўспрыняцця рускай літаратуры, што модна ўвайшла ў сучаснае жыццё рэспублікі, нараджае не толькі станоўчыя эмоцыі, але і пытанні. Некаторыя даследчыкі рускай літаратуры імкнуцца прыцягнуць да Беларусі тых, хто належыць сусветнай культуры. Яны спрабуюць адшукаць нацыянальныя карані нават у тым часе, калі беларусы яшчэ не сфармаваліся як этнас. Але ж імкненне аб'явіць іншаэтнічныя каштоўнасці сваімі - няўдзячная справа. І замест сур'езнай размовы аб беларускай школе русістыкі ўзнікае напружанасць, якая непатрэбна і ў без таго абвостраным свеце. Дык можа трэба вызначыць, аб чым гаворка: аб рускай альбо рускамоўнай літаратуры, аб беларускай літаратуры ці літаратуры Беларусі. Такая размова не зневажае ж нацыянальную годнасць.

Наперадзе, упэўнена, вырашэнне пытанняў аб перакладах, краязнаўстве, месце рускай літаратуры ў беларускім культурным асяроддзі (жывапісе, музыцы). Праблем у беларускіх спецыялістаў па рускай літаратуры шмат. З дапамогай толькі загавораў, нават калі яны ператворацца ў нейкі абавязак, іх не вырашыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ